Прадукцыя гэтага завода адрозніваецца сваёй выдатнай якасцю. Прадпрыемства поўнасцю закрывае патрэбы ўнутранага рынку і паспяхова развівае экспартныя пастаўкі, нягледзячы на санкцыі. Яго прадукцыю можна ўбачыць у Мінскім, Маскоўскім і Санкт-Пецярбургскім метрапалітэнах, а таксама на расійскіх горнаабагачальных і металургічных камбінатах «Лебядзінскі», «Міхайлаўскі», «Нарнікель» і «Поўначсталь». Усё гэта пра ААТ «Барысаўскі шпалапрапітны завод», які ў наступным годзе адзначыць сваё 125-годдзе.



# ТУТ ВЕДАЮЦЬ, ЯК ПАДОЎЖЫЦЬ ЖЫЦЦЁ ДРАЎНІНЕ

## БАГАТАЯ ГІСТОРЫЯ

Барысаўскі шпалапрапітны завод быў створаны яшчэ ў 1900 годзе па Указе Імператара Расіі Мікалая II для абслугоўвання Маскоўска-Брэсцкай чыгункі. Яго тэрыторыя на той момант складала крыху больш за два гектары. Абсталяванне прапітных працэсаў было зусім простае, таму вытворчымі магутнасцямі завод пахваліцца не мог. Драўніну тады прапітвалі дзёгцевым хімічным растворам. А ў штаце было ўсяго 22 працаўнікі і 2 служачыя.

З часам патрэба ў шпалах і пераводных брусах расла. Адпаведна вытворчасць расла і развівалася, удасканальвалася і тэхналогія насычэння шпал. Так, да 1910 года на заводзе працавала ўжо 496 чалавек. Але ж падчас Першай сусветнай вайны практычна ўсе работнікі былі прызваны ў войска, і вытворчасць спынілася. У час Вялікай Айчыннай вайны тут вялася актыўная работа падполля, якое не раз выводзіла са строю абсталяванне, рабіла падпалы сыравіны, праводзіла іншыя акты помсты. На жаль, усе гэтыя гістарычныя падзеі нанеслі непапраўную шкоду вытворчасці. Перад адступленнем фашысты вывезлі найбольш каштоўнае абсталяванне, а астатняе знішчылі. Таксама яны ўзарвалі галоўны корпус завода. Усё прыйшлося аднаўляць практычна з нуля.



Нягледзячы на ўсе выпрабаванні, завод не толькі аднавіўся, але і стаў адным з найлепшых на постсавецкай прасторы. А гісторыю тут вельмі шануюць. Так, унутраны дворык упрыгожвае помнік, які нагадвае аб стагадовым юбілеі прадпрыемства. Тут ёсць таксама традыцыя рэгулярна закладваць сады і алеі да круглых дат. А да 125-годдзя вырашылі яшчэ і поўнасцю абнавіць адміністрацыйны будынак.



Працэс павярхоўнай наколкі драўніны.

## ЗАВОД СЁННЯ



Дырэктар Генадзь ПРАСМЫЦКІ.

Першае, што ўражвае, — гэта маляўнічы ландшафт. Алеі, кветкі, кусты, а ў сезон — яшчэ і грыбы! Хто б мог падумаць, што тэрыторыя завода можа быць такой чыстай.

Варта сказаць, што да пытанняў экалогіі тут сапраўды ставяцца вельмі сур'ёзна.

— У гэтым годзе плануецца мадэрнізацыя ачышчальных збудаванняў з устаноўкай новых флататараў для ачысткі сцёкавых вод, — дзеліцца **дырэктар Генадзь ПРАСМЫЦКІ.** — Экалогія для нашага завода — вельмі сур'ёзнае пытанне. Мы знаходзімся ў межах горада Барысава, і вакол нашай вытворчасці — жылыя дамы, таму стараемся заўсёды трымаць гэтае пытанне пад кантролем.

У цэлым, на яго думку, у сферы чыгуначнай вытворчасці нельга губляць час: развіццё павінна быць пастаяннае. Дарэчы, сёлета заказаў у Барысаўскага шпалапрапітнага завода больш чым дастаткова.

— Экспарт расце з кожным годам і сёння складае каля 80 % ад агульнага аб'ёму вытворчасці. Пры гэтым мы поўнасцю пакрываем патрэбы ўнутранага рынку. Праектная магутнасць завода складае 1 млн шпал у год. Цяпер мы адпускаем прыкладна 600—700 тысяч шпал, таму ёсць куды развівацца, — распавядае дырэктар прадпрыемства.

Добрыя партнёрскія адносіны ў Барысаўскага шпалапрапітнага завода з Расійскай Федэрацыяй.

— Нядаўна мы выйшлі на новы перспектыўны рынак буйнога металургічнага кансорцыума «Поўначсталь». Два гады спрабавалі пачаць з імі супрацоўніцтва, і вось нарэшце гэта здарылася. Ужо ёсць першыя станоўчыя водгукі на нашу прадукцыю. Таксама працягваецца актыўная работа з «Нарнікелем» і растоўскімі арганізацыямі, — адзначае Генадзь Міхайлавіч.

Завод увесь час трымае руку на пульсе і шукае новыя рынкі збыту. Так, у Расіі цяпер адкрываюцца будоўлі Крайняй Поўначы, Далёкага Усходу, дзе драўляная шпала вельмі запатрабавана. Вельмі добрыя сувязі ў завода і з Азербайджанам. Так, летась яны адпусцілі прадукцыю на 1 млн долараў у эквіваленце. А яшчэ нядаўна барысаўскія шпалы пастаўляліся пробнай партыяй у Іран.



Выгрузка шпалапрадукцыі з аўтатранспарту.

## СУЧАСНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ

На дадзены момант Барысаўскі шпалапрапітны завод значна пераўзыходзіць сваіх канкурэнтаў на постсавецкай прасторы. Увесь сакрэт у працавітых людзях і своечасовай мадэрнізацыі.

— Фінансава-эканамічная сітуацыя на заводзе дазваляе развіваць нашу інвестыцыйную дзейнасць, таму працуем над гэтым. Мы ўжо абнавілі тры кабіны на казловых кранах, апошнюю заменім у чэрвені. Яны вельмі сучасныя і камфартабельныя, кожная абсталявана кандыцыянерам, — расказвае Генадзь Прасмыцкі. — Яшчэ да канца года зманціруем новую лінію пакетавання, каб максімальна аўтаматызаваць працэс складзіравання шпал і аблегчыць працу нашых работнікаў.

Таксама ў планах на будучыню — стварэнне яшчэ адной лініі пераборкі на склад натуральнай сушкі.



Намеснік дырэктара па маркетынгу Юрый ЛЮТОМСКІ.

— Наша мэта — максімальнае механізаванне працэсу. Перабраць шпалы, а потым зноў скласці іх вельмі працаёмка, — дадае дырэктар завода.

Паказалі нам і лінію павярхоўнай наколкі шпал і забіўкі кантавых пласцін, якая была ўведзена ў эксплуатацыю яшчэ ў 2013 годзе.



Склад натуральнай сушкі шпалы.

— Дзякуючы ўкараненню гэтай тэхналогіі скараціліся энергетычныя выдаткі на прапітку шпал, павялічаны тэрмін іх эксплуатацыі, — расказвае **намеснік дырэктара па маркетынгу Юрый ЛЮТОМСКІ.**

Ён адзначае таксама, што гэтая лінія ўнікальная. Такіх няма ні на адным шпалапрапітным заводзе ў краінах СНД.

Адказвае за ўсе гэтыя працэсы непасрэдна **начальнік участка прапіткі Аляксей РУСЕЦКІ**. У яго падпарадкаванні знаходзіцца каля 60 чалавек, якія нястомна працуюць для таго, каб стварыць якасны прадукт.

## НАВУКОВЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ

У складзе Барысаўскага шпалапрапітнага завода знаходзіцца дзве лабараторыі. У адной з іх мы пазнаёміліся з **лабарантам хімічнага аналізу Ларысай КЛЮЧНІК.** Яна штодзень робіць аналізы па драўніне і па сцёкавай вадзе. Апроч гэтага, у другой лабараторыі тэсціруюць антысептыкі.

— На складзе натуральнай сушкі шпала падсушваецца. Адтуль мы бяром аналізы і глядзім, які ў яе працэнт вільготнасці. У норме — да 70 %, але чым сушэй, тым лепш. Наша прадукцыя, паводле даследаванняў, выдае вынік каля 23-25 % вільготнасці, — тлумачыць Ларыса Ключнік.



Лабарант хімічнага аналізу Ларыса КЛЮЧНІК кантралюе якасць перадпрапітнай вільготнасці.

А вось аналіз сцёкавых вод дазваляе адсачыць экалагічную сітуацыю на заводзе. Перавышэння нормаў на дадзены момант заўважана не было.

Да таго ж на тэрыторыі Барысаўскага шпалапрапітнага завода ёсць лабараторыя пад адкрытым небам. Выглядае яна як невялікая пляцоўка з доследнымі ўзорамі. Што ж гэта такое? Справа ў тым, што прадпрыемства вядзе пастаянную навуковую работу з БДТУ ў сферы распрацовак новых антысептыкаў. Так, прапітныя саставы, якія выкарыстоўваюцца пры апрацоўцы шпал у Барысаве, — гэта прадукт сумесных распрацовак, а на прапітку на аснове сланцавага алею ў завода ўвогуле ёсць патэнт.




Лабараторыя пад адкрытым небам, дзе навукоўцы БДТУ правяраюць уплыў эксперыментальных саставаў на драўніну.

— Па факце гэта ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва. Для іх гэта навуковая работа, а для нас — магчымасць даваць спажыўцам заключэнне аб тым, колькі гадоў можа праслужыць наша прадукцыя, — гаворыць дырэктар завода.

## ЛЮДЗІ — ГАЛОЎНАЕ БАГАЦЦЕ

Усяго на Барысаўскім шпалапрапітным заводзе працуе 153 чалавекі. Цякучка кадраў невялікая, многія працуюць тут усё сваё жыццё. Як, напрыклад, **майстар вытворчага ўчастка Кацярына ГАСПАДАРЫК**.

— У свой час я скончыла Аршанскі каледж і прыйшла сюды працаваць. Пачала з прыёмаздатчыка і дарасла да майстра вытворчага ўчастка. Працую тут ужо 23 гады. Вельмі падабаецца гэтая спецыяльнасць. Я камунікабельная, а тут якраз з людзьмі трэба ўвесь час мець зносіны, — дзеліцца Кацярына Гаспадарык.

Нямала на вытворчасці і працоўных дынастый. Так, Уладзімір Мустафаеў прапрацаваў усё жыццё на пасадзе вадзіцеля дырэктара і пайшоў на пенсію. Цяпер яго месца займае сын Дзмітрый.

Варта адзначыць, што на прадпрыемстве з вялікай павагай ставяцца да ветэранаў працы і працаўнікоў, якія пайшлі на пенсію.

— Тым, хто прапрацаваў больш за 20 гадоў, выплачваецца па тры базавыя велічыні штомесяц, а таксама падарункі да розных свят тыпу дня нараджэння, Дня чыгуначніка і гэтак далей, — адзначае **старшыня першаснай прафсаюзнай арганізацыі і эканаміст Таццяна КАЗАКЕВІЧ.**

Усім работнікам за складанасць і ўмовы працы належыць дадатковы заахвочвальны водпуск і 50 працэнтаў кампенсацыі за аплату гарачага харчавання. Таксама літаральна сёлета ў калектыўным дагаворы прапісалі нагоды, па якіх даюцца сацыяльныя водпускі. Сярод іх — уступленне ў шлюб, 1 верасня і апошні званок, а таксама праводзіны блізкіх сваякоў на тэрміновую службу.



Старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі і эканаміст Таццяна КАЗАКЕВІЧ.

— У тых, хто прапрацаваў на заводзе тры гады, ёсць дадатковыя перавагі. Так, прадпрыемства часткова аплачвае кошт пуцёўкі ў санаторый. Акрамя таго, нашым пенсіянерам мы таксама гатовыя кампенсаваць адпачынак у санаторыі, — дадае Таццяна Казакевіч.

Аб'ядноўвае ўсіх, вядома, і маштабнае святкаванне Дня чыгуначніка з прыемнымі ўзнагародамі і грашовымі прэміямі. У спартыўнай сферы завод таксама не адстае і рэгулярна ўдзельнічае ў турніры па футболе на пераходны кубак Аб'яднанай раённай прафсаюзнай арганізацыі УП «Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі» памяці В. В. Сухаварава.

А яшчэ ў дружнага калектыву Барысаўскага шпалапрапітнага завода ёсць добрая даўняя традыцыя ездзіць на зімовую рыбалку «Клёвы рыбак». Па словах старшыні першаснай прафсаюзнай арганізацыі, людзі заўсёды з задавальненнем прымаюць удзел у гэтым мерапрыемстве, спаборнічаюць паміж сабой аб'ёмам і вагой улову, атрымліваюць дыпломы і зараджаюцца пазітывам на некалькі месяцаў.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**
**Алена ДАЎЖАНОК.**

УНП 600012389



Прапітчык піламатэрыялаў Юрый НЯЧАЕЎ кіруе аўтаматызаванай сістэмай прапіткі.



Стропальшчыкі Павел ГАРОХАВІК і Павел ХОМІЧ страпуюць груз на ўчастку прапіткі.



Майстар вытворчага ўчастка Кацярына ГАСПАДАРЫК і начальнік участка прапіткі Аляксей РУСЕЦКІ абмяркоўваюць вытворчыя пытанні.